УДК 811.161.3

# ГРАМАТЫЧНЫЯ ВІДАЗМЯНЕННІ Ў МАЎЛЕННІ КРЫЛАТЫХ ВЫРАЗАЎ З ІНШАМОЎНЫХ КРЫНІЦ

**А. Д. Цеплякова**
старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
УА "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова"
г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь
E-mail: *tepliakova@msu.by*

*У артыкуле разгледжаны граматычныя спосабы трансфармацый крылатых выразаў і афарызмаў у маўленні на матэрыяле мовы мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Вылучаюцца спалучэнні "мадальныя + структурныя змяненні", "мадальныя + марфалагічныя пераўтварэнні", "мадальныя + сінтаксічныя + марфалагічныя змяненні", "сінтаксічныя + марфалагічныя пераўтварэнні". Робіцца вывад аб прадуктыўнасці граматычных трансфармацый розных тыпаў у маўленні.*

***Ключавыя словы:*** *беларуская мова, крылатыя выразы і афарызмы, структура, змест, трансфармацыя, мова мастацкай літаратуры, мова публіцыстыкі.*

# GRAMMATICAL TRANSFORMATIONS IN SPEECH OF WINGED EXPRESSIONS FROM FOREIGN SOURCES

**A. D. Teplyakova**
Senior Lecturer of the Department of Theoretical and Applied Linguistics
of Mogilev State A. Kuleshov University,
Mogilev, Republic of Belarus
E-mail: *tepliakova@msu.by*

*The article considers grammatical ways of transformations of winged expressions and aphorisms in speech on the material of the language of fiction and of media. The combinations "modal + structural transformations", "modal + morphological transformations", "modal + syntactic + morphological transformations", "syntactic + morphological transformations" are distinguished. The conclusion is made about the productivity of grammatical transformations of different types in speech.*

***Key words:*** *Belarusian language, winged expressions and aphorisms, structure, content, transformation, language of fiction, language of media.*

**Уводзіны.** Крылатыя словы – гэта розныя па структуры і змесце цытаты з тэкставых крыніц, масава вядомыя і рэгулярна ўжывальныя ў маўленні, якія могуць страчваць асацыяцыю з сваёй крыніцай і ўжывацца як фразеалагізмы або як прыказкі [3; 4; 5; 8; 9; 14; 15; 20; 21]. Рознааспектнае вывучэнне крылатых выразаў і афарызмаў – адна з актуальных праблем сучаснага беларускага мовазнаўства [2].

Структура крылатых выразаў і афарызмаў падпадае трансфармацыям, сярод якіх трэба размяжоўваць змяненні трох тыпаў. Найперш, мадыфікацыі крылатых выразаў і афарызмаў назіраюцца пры іх запазычанні з адной мовы ў іншую [1; 22; 23; 25; 26]. Па-другое, крылатыя выразы і афарызмы змяняюцца пры іх парадыйных ці жартоўных трансфармацыях, у выніку якіх ствараюцца т. зв. "антыцытаты" [6; 7]. І па-трэцяе, крылатыя выразы і афарызмы мадыфікуюцца пры іх ужыванні ў маўленні [24], прычынай чаго з'яўляецца такая іх уласцівасць, як лаканізм [10], што перашкаджае моўніку свабодна ўбудоўваць іх у сінтаксічную будову маўлення, у выніку чаго структура крылатага выразу ці афарызма ў той ці іншай ступені відазмяняецца (без страты плану зместу). Такія відазмяненні крылатых слоў і афарызмаў у маўленні бываюць адзінкавыя і рэгулярныя, аднастайныя і камбінаваныя.

Камбінаваныя змяненні – гэта спалучэнне трансфармацыйных прыёмаў розных тыпаў у межах аднаго крылатага выразу. Камбінаваныя змяненні можна дыферэнцыраваць на аднатыпныя і рознатыпныя. Рознатыпныя трансфармацыі прадстаўляюць найбольшую цікавасць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Мэты і задачы.** Мэта даследавання – вылучыць living рознатыпныя спалучэнні трансфармацый крылатых выразаў і афарызмаў у маўленні. Для дасягнення мэты даследавання былі вырашаны наступныя задачы: 1) устаноўлены тыпы трансфармацый крылатых слоў у маўленні; 2) вылучаны граматычныя тыпы трансфармацыі крылатых слоў у маўленні; 3) апісаны разнавіднасці граматычных відазмяненняў крылатых слоў у маўленні.

**Метады і матэрыял даследавання.** Асноўны метад даследавання апісальны, заснаваны на выкарыстанні кантэкстуальнага, структурна-семантычнага і трансфармацыйнага аналізу, а таксама колькасных падлікаў.

У якасці матэрыялу даследавання выбраны ілюстрацыі ўжывання крылатых выразаў і афарызмаў у мове твораў мастацкай літаратуры і публіцыстыкі, адлюстраваныя ў даведніках крылатых слоў [11; 12; 13; 18; 19], а таксама ў фразеалагічных і парэміялагічных слоўніках [16; 17]. Усяго было прааналізавана больш за 1200 выпадкаў ужывання крылатых выразаў і афарызмаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У выніку даследавання быў вылучаны шэраг наступных рознатыпных камбінаваных трансфармацый крылатых слоў у маўленні: мадальныя + структурныя трансфармацыі (5,3 %); мадальныя + марфалагічныя трансфармацыі (1,6 %); мадальныя + сінтаксічныя + марфалагічныя трансфармацыі (2,8 %); сінтаксічныя + марфалагічныя трансфармацыі (13,2 %). У межах апошняга тыпу найбольш пашыраны наступныя камбінаваныя прыёмы:

1. Увядзенне ў стандартны кантэкст + парцэляцыя (дыстантная) + лексічная субстытуцыя + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Колькі б ні шукалі **ісціну ў віне**, на самой справе **яна** знаходзіцца ў **гарэлцы.*** (Вож., 1996, № 12) – параўн.: ***Ісціна (праўда) у віне***.

2. Дыстантная парцэляцыя + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Усе засяроджана слухалі маладога, ды не, нават юнага загадчыка літчасткі, які вельмі нагадваў Дон Кіхота ці барона Мюнхаўзена, толькі яшчэ бязвусых. Гаварыць ён стараўся гучна, выразна і, як яму, мусіць, здавалася, тэмпераментна: – Дакуль, я вас пытаюся, дарагія таварышы, нашыя паважаныя **кабеты бальзакаўскага**, а то і ўвогуле няпэўнага **ўзросту** будуць іграць хлапчукоў?! Гэта ж прафанацыя. Гэта не толькі антыэстэтычна. Гэта амаральна.* (Г. Б.) – параўн.: ***жанчына** бальзакаўскага ўзросту*.

3. Элімінацыя + марфалагічныя трансфармацыі праяўляецца ў адзінкавай мадэлі (элімінацыя асобных лексічных кампанентаў + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя), напр.: *Дзесяты ці адзінаццаты кажух шые Голуб за зіму. Ён пашыў бы болей, але гаспадар на гаспадара не прыходзіцца. У аднаго аўчын няма, у другога не выраблены, цвёрдыя, як бляха. Дый на другую работу ён адцягваўся, перашываючы розную старызну. Дзень пабольшаў. Праз акенечка стопкі Голубу відаць, якія доўгія капяжы-суслы павіслі са страхі хлява. Сонца ўсё часцей прабіваецца з-за калматых воблакаў, і капяжы безупынна капаюць. Кроплі звіняць, пяюць, падаючы з ледзяшоў, якія падобны на **застылую музыку**. Вясна на двары.* (І. Н. 1) – параўн.: ***Архітэктура** – застылая музыка*; *Але – не вяртацца ж назад, на раздарожжа, столькі праехаўшы. Уперад, толькі ўперад! Трэба паганяць **страчаны час**.* (ЛіМ, 2001, № 10–11) – параўн.: ***у пошуках** страчанага часу*.

4. Элімінацыя + субстытуцыя + марфалагічныя трансфармацыі, што рэалізуецца паводле некалькіх спосабаў.

а) элімінацыя асобных лексічных кампанентаў + лексічная субстытуцыя + намінацыйная і дзеяслоўная марфалагічныя трансфармацыі, напр.: *Выспеў час стварэння новага вучэння, ужо без Хрыста, ці, па-простаму кажучы, антыхрыстовага. Стварыў яго супляменнік Хрыста Маркс. Разам са сваім закадычным дружбаком Энгельсам яны выпусцілі **здань камунізму бадзяцца па Еўропе**. Бадзялася гэтая здань, бадзялася, пакуль не прыбілася да славян ...* (Вож., 1999, № 12) – параўн.: ***Прывід ходзіць** па Еўропе, **прывід камунізму***;

б) элімінацыя асобных лексічных кампанентаў + лексічная субстытуцыя + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Для горада, дзе зараз пераважная большасць беспрацоўных належаць да **"слабай палавіны"** і дзе налічваецца ўсяго некалькі вакансій для жанчын, без перабольшання, гэта стане сацыяльнай катастрофай.* (З-да, 12.12.2002) – параўн.: ***мая другая (лепшая)** палавіна*;

в) элімінацыя асобных лексічных кампанентаў + лексічная субстытуцыя + змяненне сінтаксічнай структуры + дзеяслоўная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Мы выкрылі сумніцельную **здань светлай будучыні, якая блукала па Еўропе**...* (Вож., 1998, № 7) – параўн.: ***Прывід ходзіць** па Еўропе, **прывід камунізму.***

5. Акалічнасная ўстаўка + дзеяслоўная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Цяпер, калі вярнуцца назад і ацаніць тое мастацтва, то мы павінны проста зняць шапку перад гэтым мастацтвам, перад яго лепшымі творамі... **Цяпер часы змяніліся.*** (ЛіМ, 14.05.1993) – параўн.: *Часы мяняюцца, <і мы мяняемся разам з імі>*.

6. Прэдыкатыўная ўстаўка + лексічная субстытуцыя + лексічная інверсія + марфалагічныя трансфармацыі, напр.: *Неяк выходзіць у нас з вамі дзіўна: запрашалі вас да сябе, а вы чамусьці ўсё не выбераце часу. **А раз Магамет да гары не ідзе, астаецца гары ісці да Магамета**.* (Лыньк.) – параўн.: *Калі **гара** не ідзе да **Магамета**, то **Магамет** ідзе да **гары***.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. Субстытуцыя + марфалагічныя трансфармацыі, што рэалізуецца паводле наступных спосабаў:

а) лексічная субстытуцыя + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Надыходзіць час, калі ў грамадстве ствараецца такая атмасфера, што яму не патрэбны сумленны прынцыповы чалавек, які мае незалежныя меркаванні, ячшэ не абалванены* ***марыянетачнай уладаю****.* (Г М.) – параўн.: *марыянетачны* ***ўрад***;

б) лексічная субстытуцыя + субстытуцыя структурных частак + дзеяслоўная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Яны падышлі да вялікага новага дома на праспекце, і гэта чамусьці канчаткова пераканала Лемяшэвіча, што Дар'я Сцяпанаўна – жанчына замужняя. Ён пажартаваў: –* ***Скажыце, дзе вы жывеце, і я скажу, хто вы****, так здаецца?* (Шам. 3) – параўн.: *Скажы <мне>,* ***хто твае сябры (твой сябра)****, <і> я скажу, хто* ***ты****.*

8. Лексічная субстытуцыя + лексічная інверсія + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя, напр.: ***З упартасцю Сізіфавай*** *// без лішніх парафраз // ён дзень за днём // успіхвае свой Камень на Парнас.* (Э. А.) – параўн.: *сізіфава* ***праца***.

9. Інверсія + марфалагічныя трансфармацыі, што рэалізуецца паводле наступных спосабаў:

а) лексічная інверсія + намінацыйная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Усмешлівая парачка схавалася за бурачковай занавескаю, пакінуўшы мяне любавацца высокім белым крэслам. Давялося пайсці далей і разглядаць штучны тавар. Заапарк у чырвоным, пурпуровым, бэзавым, ліловым святле. Людзі – жывёлы.* ***Жывёлы – людзі****.* (А. Г. 7) – параўн.: ***Чалавек – жывёла (звер)***; *Нацыя. Тут, як кажуць,* ***няма каментарыяў*** *– усё даўно ўжо сказана.* (Св., 20.02.1996) – параўн.: *Каментарыі* ***лішнія (не патрэбны)***;

б) лексічная інверсія + дзеяслоўная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Калі б не слушныя парады ды падказкі начальніка рыбааховы, не разуменне з боку кіраўніка раёна – па сённяшні дзень* ***з ветракамі ваяваў бы****.* (З-да, 28.06.2002) – параўн.: *ваяваць (змагацца) ветракамі*.

10. Змяненне сінтаксічнай структуры + дзеяслоўная марфалагічная трансфармацыя, напр.: *Часам аўтар аповеду трапляе ў палон да, як цяпер кажуць, харызматычнай асобы героя і за ім следам імкнецца ахапіць неабдымнае, "пераблытаць дзень і ноч",* ***"спыніць імгненне"****, каб выказаць самае шчырае захапленне.* (ЛіМ, 2001, № 7) – параўн.: *Спыніся імгненне! <Ты цудоўнае>*.

**Высновы.** Такім чынам, найбольш прадуктыўным спосабам змянення крылатых выразаў і афарызмаў у маўленні з'яўляецца "сінтаксічныя + марфалагічныя трансфармацыі". У сваю чаргу, найбольш разгалінаванымі прыёмамі змянення крылатых выразаў і афарызмаў у маўленні з'яўляюцца спалучэнні "мадальныя + структурныя трансфармацыі", "мадальныя + сінтаксічныя + марфалагічныя трансфармацыі".

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1.Венідзіктаў, С. В. Рускамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай мове / С. В. Венідзіктаў, Я. Я. Іваноў // Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. – 2002. – T. VIII. – S. 210–217.

2.Иванов, Е .Е. Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) / Е. Е. Иванов // XV Міжнародны з'езд славістаў = XV Международный съезд славистов = XV International Congress of Slavists, Мінск, 20–27 жніўня 2013 г. : тэзісы : у 2 т. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – Т. 1. – С. 322–323.

3.Иванов, Е. Е. К разграничению понятий воспроизводимости и рекуррентности афористических фраз / Е. Е. Иванов // Материалы XXXII Междунар. филол. конф., 11–15 марта 2003 г. – Санкт-Петербург : Филол. фак. СПбГУ, 2003. – Вып. 14. – С. 14–23.

4.Иванов, Е. Е. О рекуррентных прототипах крылатых фраз / Е. Е. Иванов // Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах. – Гомель : ГГУ, 2003. – С. 74–78.

5.Иванов, Е. Е. Языковая природа крылатых слов / Е. Е. Иванов // Праблемы беларускага літаратуразнаўства. – Мінск : МНТ, 2000. – С. 303–312.

6.Іванова, С. Ф. Антыцытаты ў сучаснай беларускай мове / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў // Phraseologische Studien: Dynamische Tendenzen in der slawischen Phraseologie. – Greifswald : E.M.A.-Universität, 2010. – S. 174–183.

7.Іванова, С. Ф. Парадыйныя, іранічныя і жартоўныя трансфармацыі крылатых выразаў (да складання слоўніка беларускіх антыпрыказак) / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў, В. А. Шпакоўская // Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі. – 2011. – Вып. 4. – С. 52–61.

8.Іваноў, Я. Я. Афарыстычнае выказванне як моўная мадэль крылатых слоў / Я. Я. Іваноў // Філологічні студії. – 2017. – Вип. 16. – С. 114–121.

9.Іваноў, Я. Я. Крылатыя словы / Я. Я. Іваноў // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 729–730.

10. Іваноў, Я. Я. Лаканізм / Я. Я. Іваноў // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 2. – С. 7–9.

11. Іваноў, Я. Я. Крылатыя афарызмы ў беларускай мове: з іншамоўных літаратурных і фальклорных крыніц VIII ст. да н.э.– XX ст. : тлумачальны слоўнік / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ, 2011. – 164 с.

12. Крылатыя выразы ў беларускай мове : тлумачальны слоўнік. Ч. 1 : З іншамоўных крыніц XII–XX стст. – Магілёў : МДУ, 2004. – 136 с.

13. Крылатыя выразы ў беларускай мове : тлумачальны слоўнік. Ч. 2 : З рускамоўных літаратурных і фальклорных крыніц XII–XX стст. – Магілёў : МДУ, 2006. – 208 с.

14. Лепешаў, І. Я. Крылатыя словы / І. Я. Лепешаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1986. – Т. 3. – С. 137.

15. Лепешаў, І Я. Крылатыя словы і фразеалагізмы / І. Я. Лепешаў // Роднае слова. – 1992. – № 9. – С. 38–41.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

16. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 2014. – 141 с.
17. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 443 с.
18. Лепта библейской мудрости : русско-славянский словарь библейских выражений и афоризмов с соответствиями в германских, романских, армянском и грузинском языках : в 2 т. / под ред. Е. Е. Иванова [и др.]. Могилёв : МГУ, 2019. Т. 1. 334 с.
19. Лепта библейской мудрости : русско-славянский словарь библейских выражений и афоризмов с соответствиями в германских, романских, армянском и грузинском языках : в 2 т. / под ред. Е. Е. Иванова [и др.]. – Могилёв : МГУ, 2019. – Т. 2. 308 с.
20. Ломакина, О. В. Крылатика в современном культурном контексте / О. В. Ломакина, В. М. Мокиенко // Вестник Российского университета дружбы народов. Серия: Теория языка. Семиотика. Семантика. – 2019. – Т. 10. – № 2. – С. 256–272.
21. Міхневіч, А. Я. Крылатыя словы / А. Я. Міхневіч // Беларуская мова : энцыклапедыя. Мінск : БелЭн, 1994. С. 273–274.
22. Теплякова, А. Д. Иноязычные заимствования крылатых слов в белорусском и немецком языках / А. Д. Теплякова // Материалы VI Междунар. науч. конф. «Язык, культура, общество», Москва, 22–25 сентября 2011 г. – М. : МИИЯ, 2011. – С. 125–126.
23. Теплякова, А. Д. Источники крылатых выражений в белорусском языке / А. Д. Теплякова // Фразеология и языковая динамика. – Greifswald: E.-M.-A. Universität; СПб. : СПбГУ, 2011. – С. 67–69.
24. Цеплякова, А. Д. Асноўныя віды трансфармацыі клішэ ў тэксце / А. Д. Цеплякова // Итоги научных исследований учёных МГУ имени А. А. Кулешова 2017 г. – Могилёв : МГУ, 2018. – С. 89–91.
25. Цеплякова, А. Д. Запазычаныя крылатыя выразы ў сучаснай беларускай мове / А. Д. Цеплякова, С. Ф. Іванова // Phraseology of Germanic, Romanic and Slavic Languages. – 2009. – Вып. 1. – С. 98–112.
26. Цеплякова, А. Д. Літаратурныя крыніцы фразеалагічных адзінак, запазычаных з нямецкай мовы ў беларускую мову (па-за межамі этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў / А. Д. Цеплякова, Я. Я. Іваноў // Немецкий язык лингводидактическое обеспечение и методика преподавания. – Могилёв : МГУ, 2019. – С. 82–87.

**References**

1. Venidziktau, S. V. & Ivanou Ya.Ya. (2002). Ruskamounyya zapazychanni krylatyh slou u suchasnaj belaruskaj move. *Dziedzistwo przeszlości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-balto-wschodnioslowiańskich*. T. VIII. S. 210–217. (In Bel.).
2. Ivanov, E. E. (2013). Belorusskaya paremiologiya i aforistika v obshheevropejskom kontekste (aktualnye problemy izucheniya. *XV International Congress of Slavists, Minsk, 20–27.08.2013: in 2 t.* – Minsk : Belaruskaya navuka. T. 1. S. 322–323. (In Russ.).
3. Ivanov, E. E. (2003). K razgranicheniyu ponyatij vosproizvodimosti i rekurrentnosti aforisticheskih fraz. *Materialy XXXII Mezhdunar. filol. konf , 11–15.03.2003*. Sankt-Peterburg : Filol. fak. SPbGU. Vyp. 14. S. 14–23. (In Russ.).
4. Ivanov, E. E. (2003). O rekurrentnyh prototipah krylatyh fraz. *Slavyanskaya frazeologiya v arealnom, istoricheskom i etnokulturnom aspektah*. Gomel : GGU. S. 74–78. (In Russ.).
5. Ivanov, E.E. (2000). Yazykovaya priroda krylatyh slov. *Prablemy belaruskaga litaraturaznaustva*. Minsk : MNT. S. 303–312. (In Russ.).
6. Ivanova, S. F. & Ivanou, Ya.Ya. (2010). Antycytaty u suchasnaj belaruskaj move. *Phraseologische Studien: Dynamische Tendenzen in der slawischen Phraseologie*. Greifswald : E.M.A.-Universität. S. 174–183. (In Bel.).
7. Ivanova, S. F., Ivanou Ya.Ya. & Shpakouskaya, V. A. (2011). Paradyjnyya, iranichnyya i zhartounyya transfarmacyi krylatyh vyrazau. *Dasledavanni pa germanskaj i slavyanskaj filalogii*. Vyp. 4. S. 52–61.
8. Ivanou, Ya. Ya. (2017). Afarystychnae vykazvanne yak mounaya madel krylatyh slou. *Filologichni studiї*. Vip. 16. S. 114–121. (In Bel.).
9. Ivanou, Ya. Ya. (2005). Krylatyya slovy. *Belaruski falklor: encyklapedyya: u 2 t.* Minsk : BelEn. T. 1. S. 729–730. (In Bel.).
10. Ivanou, Ya. Ya. (2005). Lakanizm. *Belaruski falklor: encyklapedyya: u 2 t.* Minsk : BelEn. T. 2. S. 7–9. (In Bel.).
11. Ivanou, Ya. Ya. (2011). *Krylatyya afaryzmy u belaruskaj move: z inshamonyh litaraturnyh i falklornyh krynic: tlumachalny slounik*. Magilyou : MDU. 164 s. (In Bel.).
12. *Krylatyya vyrazy u belaruskaj move: tlumachalny slounik. Ch. 1: Z inshamounyh krynic XII–XX stst.* (2004). Magilyou : MDU. 136 s. (In Bel.).
13. *Krylatyya vyrazy u belaruskaj move: tlumachalny slounik. Ch. 2: Z ruskamounyh litaraturnyh i falklornyh krynic XII–XX stst.* (2006). Magilyou : MDU. 208 s. (In Bel.).
14. Lepeshau, I.Ya. (1986). Krylatyya slovy. *Encyklapedyya litaratury i mastacztva Belarusi: u 5 t.* Minsk : BelSE. T. 3. S. 137. (In Bel.).
15. Lepeshau, I. Ya. (1992). Krylatyya slovy i frazealagizmy. *Rodnae slova*. № 9. S. 38–41. (In Bel.).
16. Lepeshau, I. Ya. (2004). Etymalagichny slounik frazealagizmau. Minsk : BelEn. 443 s. (In Bel.).
17. Lepeshau, I. Ya. (2014). Etymalagichny slounik prykazak. Minsk : Vyshejshaya shkola. 141 s. (In Bel.).
18. *Lepta biblejskoj mudrosti: russko-slavyanskij slovar biblejskix vyrazhenij i aforizmov: v 2 t.* (2019). Red. E. E. Ivanov [i dr.]. Mogilyov : MGU. T. 1. 334 s. (In Russ.).
19. *Lepta biblejskoj mudrosti: russko-slavyanskij slovar biblejskix vyrazhenij i aforizmov: v 2 t.* (2019). Red. E. E. Ivanov [i dr.]. Mogilyov : MGU. T. 2. 308 s. (In Russ.).
20. Lomakina, O. V. & Mokienko, V. M. (2019). Krylatika v sovremennom kulturnom kontekste. Vestnik Rossijskogo universiteta druzhby narodov. Seriya: Teoriya yazyka. Semiotika. Semantika. T. 10. № 2. S. 256–272. (In Russ.).
21. Mixnevich, A. Ya. (1994). Krylatyya slovy. *Belaruskaya mova: encyklapedyya*. Minsk : BelEn. S. 273–274. (In Bel.).
22. Teplyakova, A. D. (2011). Inoyazychnye zaimstvovaniya krylatyh slov v belorusskom i nemeczkom yazykah. *Materialy VI Mezhdunar. nauch. konf «Yazyk, kultura, obshhestvo», Moskva, 22–25.09.2011*. Moskwa : MIIYa. S. 125–126. (In Russ.).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

23. Teplyakova, A. D. (2011). Istochniki krylatyh vyrazhenij v belorusskom yazyke. *Frazeologiya i yazy`kovaya dinamika*. Greifswald: E.M.A.-Universität; Sankt-Peterburg : SPbGU. S. 67–69. (In Russ.).
24. Ceplyakova, A. D. (2018). Asnounyya vidy transfarmacyi klishe u teksce. *Itogi nauchnyh issledovanij uchyonyh MGU imeni A. A. Kuleshova 2017 g*. Mogilyov : MGU. S. 89–91. (In Bel.).
25. Ceplyakova, A. D. & Ivanova, S. F. (2009). Zapazychanyya krylatyya vyrazy u suchasnaj belaruskaj move. *Phraseology of Germanic, Romanic and Slavic Languages*. Vyp. 1. C. 98–112. (In Bel.).
26. Ceplyakova, A. D. & Ivanou, Ya. Ya. (2019). Litaraturnyya krynicy frazealagichnyh adzinak, zapazychanyh z nyameczkaj movy u belaruskuyu movu. *Nemeczkij yazyk lingvodidakticheskoe obespechenie i metodika prepodavaniya*. Mogilyov : MGU. C. 82–87. (In Bel.).
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова